Рассмотренные примеры показывают, что применение новейших интернет-технологий при организации самостоятельной работы студентов позволяет значительно расширить рамки учебного процесса, сделать его более интересным, эффективным и оптимальным. Определим необходимые условия проведения самостоятельной работы студентов с использованием интернет-технологий: возможность свободного и качественного доступа к Интернет для преподавателей и студентов; организация своевременно обновляемого портала университета; возможность организовать на сайте университета форумы и конференции; размещение на сайте университета сведений о предстоящих конференциях, семинарах, выставках. Выполнение этих условий позволит эффективно использовать интернет-технологии при организации самостоятельной работы студентов.

---


1. *Антиплагиат.* О проекте // [Электронный ресурс]. – Режим доступа:http://www.antiplagiat.ru.

2. *Коптюг, Н.М.* Интернет-проект как дополнительный источник мотивации учащихся / Н.М. Коптюг // Иностранные языки в школе. – 2003. – № 3.

3. *Полат, Е.С.* Интернет в гуманитарном образовании / Е.С Полат, М.В. Моисеева, А.Е. Петров: учеб. пособие для вузов. – М.: ГИЦ Владос, 2001 – 272 с.

4. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова. – Мн.: РИВШ, 2005. – 131с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**П.Р. Ігнатовіч**, *прафесар*

## АРГАНІЗАЦЫЯ І КАНТРОЛЬ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ САЦЫЯЛОГІІ

Важнейшая задача сучаснай вышэйшай адукацыі – фарміраванне высокапрафесійнага, эрудыраванага, ініцыятыўнага, творчага спецыяліста, які здольны жыць і працаваць ва ўмовах інфармацыйнага выбуху, глабалізацыі, станаўлення рыначных

адносін. Гэта накладвае на навучэнцаў неабходнасць набыцця не толькі неабходных ведаў, але і сістэмы ўменняў, навыкаў прымянення іх у жыцці, авалодвання шматграннымі прыёмамі творчага мыслення і даследавання. Безумоўна, такія задачы ў вучэбным працэсе можна вырашаць сумеснымі намаганнямі выкладчыкаў і студэнтаў, выкарыстоўваючы шырокі арсенал метадаў, сродкаў, формаў з улікам асаблівасцей кожнай выкладаемай дысцыпліны.

"Канцэпцыяй нацыянальнай школы Беларусі" сфармуляваны асновы падрыхтоўкі спецыялістаў адпаведна патрабаванням сучаснага грамадства. Сярод іх: арыентацыя ў адукацыі на развіццё здольнасцей, звязаных з дзейным мысленнем; у сувязі з узрастаннем дынамізму грамадскага жыцця – арыентацыя на фарміраванне сістэмнага мыслення; змена ролі педагога ў адукацыйным працэсе – адмаўленне ад пазіцыі носьбіта абсалютнай ісціны, калі "педагог мае права" прымаць рашэнне за навучэнцаў; прызнанне роўнасці розных відаў чалавечага вопыту; устаноўка на светапоглядны плюралізм.

Гэтыя асновы патрэбна ўлічваць пры арганізацыі ўсяго навучальнага працэсу, у тым ліку і арганізацыі самастойнай работы. Галоўная мэта вучэбнага працэсу заключаецца не толькі ў перадачы ведаў, уменняў і навыкаў ад выкладчыка студэнту, але і ва ўсямерным развіцці ў студэнтаў здольнасцей да пастаяннай, бесперапыннай самаадукацыі, папаўнення і абнаўлення ведаў, творчага іх выкарыстання на практыцы – здольнасцей набываць і ўдасканальваць свае веды самастойна на працягу ўсяго жыцця [1; 2; 3]. Трэба мець на ўвазе, што рэальна існуючую супярэчнасць паміж узрастаючым аб'ёмам неабходных для вывучэння ведаў і абмежаваным бюджэтам часу можна вырашыць толькі праз інтэнсіфікацыю пазнавальнай актыўнасці студэнта. У гэтым працэсе, безумоўна, галоўная роля належыць самастойнай рабоце студэнтаў, якая з'яўляецца адной з важнейшых формаў падрыхтоўкі адукаванай, творчай і прафесійна мабільнай асобы. Даследчыкі выдзяляюць часцей за ўсё два ўзроўні гэтай работы: самастойная работа студэнтаў, кіруемая выкладчыкам, і ўласна самастойная работа.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Праблема арганізацыі самастойнай работы студэнтаў зусім не новая, яна пастаянна ўзнікае, па сутнасці, на працягу ўсёй гісторыі развіцця прафесійнай адукацыі. Аднак на розных этапах яна мела тыя ці іншыя асаблівасці і акцэнты. Сёння навукова-педагагічная грамадскасць у сувязі са зменай сітуацыі і мэтамі адукацыйнага працэсу робіць новыя акцэнты. У прыватнасці, робяцца пэўныя захады па навуковым абгрунтаванні паняційна-катэгарыяльнага апарату, звязанага з даследаваннем гэтай важнай праблемы. Разглядаюцца паняцці: самастойная работа (СР), кіруемая самастойная работа (КСР), кантралюемая самастойная работа і інш. [4, с. 33]. З пункту гледжання дзейнаснага падыходу можна зрабіць акцэнт на азначэнні: "Самастойная работа студэнтаў – гэта мэтанакіраваная, унутрана матываваная, структурыраваная самім суб'ектам (студэнтам) і карэкціруемая ім дзейнасць" [3, с.11].

Пад кіруемай самастойнай работай трэба разумець асобым чынам арганізаваную мэтанакіраваную дзейнасць выкладчыка і студэнтаў, заснаваную на ўсвядомленай індывідуальна-групавой пазнавальнай актыўнасці па сістэмным авалодванні асобасна і прафесійна значнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, спосабамі іх атрымання і прад'яўлення. Пры гэтым цэнтр цяжару пераносіцца на саманавучанне [2, с. 45; 5, с. 5]. Кіруемая самастойная работа студэнтаў – гэта ўсё тое, што студэнт павінен сам выканаць, прапрацаваць, вывучыць па заданні і пад кіраўніцтвам і кантролем выкладчыка. Такім чынам, кіруемая самастойная работа студэнтаў – гэта такі від дзейнасці, разам з лекцыямі, семінарскімі і практычнымі заняткамі, у ходзе якой студэнт, кіруючыся спецыяльнымі метадычнымі ўказаннямі выкладчыка, набывае і ўдасканальвае веды, уменні і навыкі, назапашвае вопыт практычнай дзейнасці.

Пры арганізацыі самастойнай работы студэнтаў важнае значэнне мае вучэбна-метадычнае забеспячэнне, у тым ліку і на электронных носьбітах. Вывучэнне курса сацыялогіі ў нашым універсітэце ажыццяўляецца па тыпавой праграме для курса і вучэбнай праграме, распрацаванай з улікам профілю універсітэта, са спісам рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры. Студэнты забяспечаны дастатковай колькасцю падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку прапануецца і дапаможнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтара гэтага артыкула на беларускай мове (друкаваны і ў электронным варыянце). Для семінарскіх заняткаў распрацаваны планы, у якіх прадугледжаны тэматыка рэфератаў, пытанні для самакантролю, рэкамендаваная па тэме літаратура.

Розныя аўтары выдзяляюць тры, чатыры ці нават пяць этапаў кіруемай самастойнай работы студэнтаў [4, с. 34]. Мы засяродзім увагу толькі на некаторых аспектах.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў па любой вучэбнай дысцыпліне павінна прадстаўляць сабой не проста пэўны набор заданняў, а мэтанакіраваны працэс супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта. Найперш увага павінна ўдзяляцца вызначэнню задання – канкрэтнага і дакладнага, з улікам колькасці часу на яго выкананне. Напрыклад, пры вывучэнні раздзела "метадалогія і методыка сацыялагічных даследаванняў" студэнты атрымліваюць заданні:

– распрацаваць праграму (макет праграмы) даследавання па пэўнай тэме;

– распрацаваць анкету для правядзення пісьмовага апытання (анкетавання), апытальны ліст для правядзення інтэрв'юіравання;

– распрацаваць праграму правядзення назірання і г. д.

Формы самастойнай работы могуць быць самымі разнастайнымі:

– падрыхтоўка да лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў;

– канспектаванне і рэферыраванне пэўных літаратурных крыніц, пэўных тэм з манаграфій, хрэстаматый, падручнікаў;

– напісанне дакладаў, рэфератаў, эсэ;

– выкананне кантрольных і іншых пісьмовых работ.

Эфектыўнымі формамі самастойнай работы па сацыялогіі з'яўляюцца падрыхтоўка студэнтамі дакладаў, заслухоўванне і абмеркаванне іх на семінарскіх занятках; напісанне рэфератаў з далейшай іх праверкай і абмеркаваннем у дні кансультацый. Студэнты рыхтуюць эсэ па адной з рэкамендаваных праблемных тэм, кароткія біяграфічныя звесткі аб вядомых сацыёлагах, аб іх укладзе ў распрацоўку тых ці іншых праблем; пісьмовы агляд па пэўнай праблеме; складанне слоўніка (гласарыя) па асобнай тэме, раздзелу ці ўсяму курсу. Аб творчым патэнцыяле студэнтаў сведчыць самастойная распрацоўка студэнтамі тэстаў па пэўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемах, складанне сцэнарыяў дзелавых гульняў, распрацоўка рэбусаў і красвордаў.

Вызначэнне патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да заданняў, залежыць ад мэты вучэбнай і даследчыцкай дзейнасці студэнтаў, узроўню складанасці прапануемай самастойнай работы, ад крытэрыяў ацэнкі самой работы [3, с. 89].

Пры арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, безумоўна, трэба ўлічваць форму навучання. Калі для студэнтаў стацыянара дзейснымі з'яўляюцца названыя вышэй фактары, то для студэнтаў завочнага навучання, напрыклад, акцэнт робіцца на выкананні і абароне кантрольнай работы, якая прадугледжваецца вучэбным планам. У сувязі з абмежаванымі магчымасцямі вочных сустрэч студэнта і выкладчыка метадычныя рэкамендацыі да заданняў па кантрольнай рабоце павінны быць максімальна канкрэтнымі і поўнымі.

Формы кантролю самастойнай работы могуць быць самымі рознымі ў залежнасці ад вывучаемай праблемы, з улікам індывідуальных якасцей асобных студэнтаў, групы і патоку ў цэлым: пісьмовыя работы, тэсціраванне, разнастайныя актыўныя формы семінарскіх заняткаў, рубежны кантроль.

Важнымі фактарамі дасягнення эфектыўнасці самастойнай работы з'яўляюцца:

1. Сістэматычная і сістэмная работа кожнага студэнта на працягу семестра, усяго навучальнага года. Сістэмнасць – гэта не толькі выкананне пэўнай колькасці заданняў, але і рэгулярны, актыўны ўдзел ва ўсіх відах заняткаў.

2. Для прадуктыўнай самастойнай работы неабходна сістэма матывацый. Павышэнню матывацыі спрыяе не толькі абавязковы кантроль, але і разгорнутая ацэнка выкананага задання. Для студэнта часта важны не столькі тып задання, колькі праяўленне зацікаўленасці выкладчыка і калег-студэнтаў да вынікаў і ацэнкі гэтай работы.

3. Сістэматычны, з прымяненнем разнастайных формаў, кантроль з боку выкладчыка за ходам самастойнай работы студэнта.

Такім чынам, арганізацыя і правядзенне самастойнай работы студэнтаў павінны прадстаўляць прадуманную сістэму, якая

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

грунтуецца на ўзаемадзеянні выкладчыка і студэнтаў на ўсім працягу вучэбнага працэсу.

1. *Казимирская, И.И.* Контролируемая самостоятельная работа студентов как категория дидактики / И.И. Казимирская // Народная асвета. – 2005. – № 7.

2. *Лобанов, А.П.* Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Мн., 2005.

3. *Педагогические* основы самостоятельной работы студентов / О.Л. Жук [и др.]; под общ. ред. О.Л.Жук. – Мн., 2005.

4. *Решетникова, И.В.* Организация и контроль управляемой самостоятельной работы студентов / И.В. Решетникова // Вышэйшая школа. – 2007. – №2.

5. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В.Сергеенкова. – Мн.: РИВШ, 2005.

**А.В. Калашникова**, *старший преподаватель*

## ТРАДИЦИОННЫЕ И ИННОВАЦИОННЫЕ МЕТОДЫ И ФОРМЫ УПРАВЛЯЕМОЙ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ

(кафедра менеджмента социокультурной деятельности)

Практическая социально-культурная деятельность – это культурно-досуговая деятельность клубов, домов и дворцов культуры, парков культуры, библиотек, музеев, выставочных залов и т. д. Менеджер в данной сфере деятельности – человек, способный *самостоятельно* решать слабоструктурированные задачи в различных ее областях. Как справедливо замечает культуролог В. Е. Новаторов, содержание социально-культурной деятельности столь широко (организация досугового общения; развитие традиций, возрождение и внедрение народных праздников, обрядов, обычаев и ритуалов; формирование и распространение общественного мнения по актуальным вопросам современности посредством разнообразной информационно-просветительской

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ